Болбас, В. С. Марально-выхаваўчы патэнцыял традыцыйнай культуры Мазырскага Палесся / Болбас Валерый Сяргеевіч // Мастацтва, фальклор, этнічныя традыцыі ў вырашэнні актуальных задач сучаснай культуры : матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 50-гадоваму юбілею Інстытута мастацтвазнаўства, этналогіі і фальклора імя К. Крапівы, Мінск, 7–8 чэрвеня 2007 г. – Мінск, 2007. – Ч. 1. – С. 25–32.

# МАРАЛЬНА-ВЫХАВАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ МАЗЫРСКАГА ПАЛЕССЯ

Болбас Валерый Сяргеевіч (УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, Мазыр, Рэспубліка Беларусь)

*Раскрыты этыка-педагагічны патэнцыял традыцыйнай культуры Мазырскага Палесся. Прааналізаваны маральны ідэал, прынцыпы і метады народнага выхавання, паказана роля асобных відаў і жанраў палескага фальклору ў фарміраванні маральнай асобы. Адзначана самабытнасць марально-выхаваўчых ідэй народнай педагогікі палешукоў.*

Крызіс выхавання падрастаючых пакаленняў, аб якім з трывогай загаварылі ў апошні час, хоць і з'яўляецца істотным перабольшваннем, але адлюстроўвае наяўнасць таго складанага становішча, у якім апынуліся сучасныя педагагічная тэорыя і практыка.

Найважнейшай прычынай выхаваўчых няўдач з'яўляецца парушэнне прынцыпу пераемнасці, адрыў ад этнапедагагічных каранёў, ігнараванне дасягненняў традыцыйнай культуры. Пры ўсёй знешняй прывабнасці замежных набыткаў выкарыстанне іх у нашых умовах павінна адбывацца пасля ўдумлівага і ўзважанага асэнсавання. Бясспрэчная выснова, да якой праз шматвяковы вопыт прыйшлі нашы продкі, заключаецца ў тым, што ўсё новае, што з'яўляецца ў духоўным жыцці, ні ў якім разе не можа штучна разбураць існаваўшае. Яно павінна самым натуральным чынам дапаўняць, удасканальваць, развіваць спадчыну папярэднікаў. Недаацэнка гэтага вядзе да самых згубных наступстваў. Разбурэнне традыцыйнай культуры народа – гэта яго духоўная пагібель, якая прывядзе да фізічнага выраджэння і фактычнага знікнення на дэмаграфічнай карце свету. Засваенне кожным індывідуумам сістэмы народных каштоўнасцей уздымае сацыялізуючую ролю традыцыйнай культуры, робіць яе выхаваўчую функцыю адной з найбольш актуальных.

У плане захавання і творчага выкарыстання традыцыйнай педагагічнай культуры неацэннае значэнне мае глыбокае вывучэнне яе рэгіянальных асаблівасцей, дзе праяўляюцца як агульныя, адметныя для этнаса характарыстыкі, так і арыгінальныя асаблівасці насельніцтва пэўнай мясцовасці. Гэта важна не толькі для ўсебаковага, глыбокага раскрыцця народнай культуры ва ўсёй яе шматграннасці і паўнаце, а і ў чыста прагматычным плане для павышэння эфектыўнасці вынікаў яе ўжытку. Для

Беларусі такім унікальным і самабытным рэгіѐнам прадстае прарадзіма славян – Палессе і ў прыватнасці ўсходняя яго частка – Мазырска-Прыпяцкі край. Дзякуючы шэрагу гістарычных фактараў тут на працягу многіх стагоддзяў сфарміравалася адметная, адносна самастойная сацыяльна-культурная прастора з своеасаблівай устойлівай духоўнай культурай. Яе вывучэнне дазваляе сцвярджаць, што традыцыйна-пабытовая культура палешукоў, з'яўляючыся па сутнасці поліфункцыянальнай, выконвала важную камунікатыўную і выхаваўчую ролю, у ѐй цесна перапляталіся светапоглядныя, маральныя і этычныя пачаткі. Маючы на мэце захаванне і далейшае развіццѐ этнаса, народная педагогіка вырашала гэтае пытанне праз падрыхтоўку чалавека да самастойнага практычнага жыцця. Прычым, маральна-духоўная састаўляючая такой падрыхтоўкі ў палешукоў з'яўлялася найважнейшай. Яшчэ з язычніцкіх часоў каштоўнасць чалавека праяўлялася не толькі і не столькі ў тым, што ѐн прадстаўляе сабой як канкрэтны індывід, а што ѐн уяўляе сабой як часцінка пэўнай супольнасці. Асабістыя якасці не сказаць, што не цаніліся, а разглядаліся з пункту гледжання іх вартасці для грамадства. Прыродна-геаграфічныя і кліматычныя ўмовы ў дапаўненне гістарычным абставінам развілі і сфарміравалі калектывісцкую арыентацыю палешукоў да вельмі высокага ўзроўню. Само паняцце дабра разглядалася, як карысць для іншых. Фальклорная скарбонка народнай мудрасці напаўняла пастулаты аб перавазе калектыўнага ладу жыцця. У адной з казак, запісанай А.К. Сержпутоўскім на Палессі гэта гучыць так: "І пачаў Асілак навучаць, каб людзі жылі ў згодзе да ў ласцэ. Тады, кажа, ніякае ліха з імі не справіцца, бо згодная грамада, бы адзін вялікі чалавек, вялікі багатыр, дужэйшы за ўсіх багатыроў" [3, 89].

Маральны ідэал уяўляў сабой шматбаковаразвітую дабрачынную, цнатлівую асобу з высокім узроўнем духоўнасці. Цікава адзначыць, што побач з агульнапрынятымі маральнымі якасцямі такімі, як добразычлівасць, міласэрнасць, памяркоўнасць, разважлівасць, цярплівасць, паслухмянасць, акцэнтавалася ўвага і на пачуцці ўласнай годнасці "бо лічылі, што на схіленае дрэва і козы залазяць", а залішняя цярплівасць магла перайсці ў раз'юшаны гнеў. Так, адкрытая пагроза гучыць у адным з загавораў, запісаным у Лельчыцах: "Вынь зубу з рыбу, з кошчэй, з машчэй, з румяное крыві, а не то возьму меч і твая галава з плеч" [4]. У іерархіі маральных каштоўнасцей палешукі на бясспрэчна першае месца вылучалі працалюбства. Прычым, адносіны да працы напаўняліся высокім этычным сэнсам: "Менш гавары, ды больш рабі" [1, 234]; "Работа хлеб салодзіць" [1, 239]; "Работа чалавека лечыць" [1, 240]. Станоўчыя адносіны фарміраваліся толькі да агульна карыснай, стваральнай працы. Далучэнне да працы на Палессі пачыналася з маленства, пра што яскрава сведчыць дзіцячы фальклор.

Пэўныя канкрэтныя працоўныя абавязкі і даручэнні мелі дзеці пяцігадовага ўзросту. З ростам дзіцяці яны пашыраліся і ўскладняліся. Працэс уключэння ў працоўную дзейнасць адбываўся паступова, натуральна, без штучных "рыўкоў" і пераходаў. У гэтым сэнсе нават цяжка правесці мяжу, калі заканчвалася дзяцінства і пачыналася дарослае жыццѐ. Такія

адносіны да працы фарміравалі шэраг іншых маральных якасцей, таму выхаванне працай і ў працы складала ядро народнай педагогікі палешукоў. Менавіта па гэтай прычыне ўсю народна-выхаваўчую сістэму не без падстаў называюць педагогікай працы. Невыпадкова, што крытэрыем маральнасці асобы з’яўляецца не проста наяўнасць пэўнай сукупнасці адпаведных рыс і якасцей, а рэальныя дзеянні, учынкі і паводзіны чалавека. Не словы, імкненні, намеры, эмацыянальныя адносіны, а канкрэтныя справы павінны вызначаць маральную годнасць чалавека.

У палешукоў у большай ступені, чым у іншых прадстаўнікоў беларускага народа побач з хрысціянскім бачаннем свету захаваліся язычніцкія ўяўленні. Шматлікія павер’і надаюць маральнаму выхаванню непаўторны каларыт, часта істотна павышаюць яго выніковасць. Сама рэлігійнасць прадстаўнікоў Мазырскага Палесся вызначаецца глыбінным унутраным, інтравертным характарам. Яна не столькі падпарадкоўваецца царкоўна-абрадавым прадпісанням, колькі выступае ў якасці голасу ўласнага сумлення, маральна-духоўнага абавязку перад Творцай, людзьмі і сабой, што яшчэ больш уздымала ролю маральнага выхавання. “Бог з пугаю не стаіць, як хочаш можаш жыць”, – заключалі ў народзе [Касько, У.К. Палескі дзівасіл: Бел. нар. прыказкі, прымаўкі, выслоўі: са скарбніцы А.К. Сержпутоўскага / У.К. Касько. Мінск: Выш. шк., 2005. 383 с., 227].

Патрыятычныя якасці палешукоў таксама нясуць на сабе адбітак геаграфічных і гістарычных умоў жыцця. Любоў да радзімы, яе народа носіць выразна лакальна-абмежавальны характар, завяршаецца малой Бацькаўшчынай. Яна амаль цалкам і поўнасцю характарызуецца замілаваннем родным куточкам і характарызуецца высокім узроўнем лірізму душы: “У чужым краю песні не пяю” [1, 243]. Ні ваяўнічасці, ні помслівасці практычна неназіраецца ў насельніцтва Палесся: “Бо й ворага ў бядзе шкода” [3, 42].

Адносіны да роднага краю выразна праяўляюцца і ў адносінах да прыроды. На звяроў, птушак і розных іншых жывых істот паляшук у поўным сэнсе гэтага слова глядзіць, як на братоў меншых. Дрэвы, расліны таксама адухаўляюцца, надзяляюцца пэўнымі чалавечымі якасцямі. Вельмі часта ў народным фальклоры прадстаўнікі жывой і не жывой прыроды як носьбіты вартасных арыентацый, характэрных для грамадства, выступалі ў якасці ідэала маральнага ўдасканалення. Ужываючы сучасны лексікон можна сцвярджаць, што экалагічны аспект маральнага выхавання Мазырскага Палесся адпавядаў самым высокім меркам і сѐння з’яўляецца ўзорам беражлівых адносін да прыродных багаццяў.

Усѐ багацце традыцыйна-педагагічнай культуры палешукоў, ідэі маральнага выхавання як і ўся народная мудрасць з’яўляліся сутнасным напаўненнем усіх відаў і жанраў фальклору, якімі надзвычай багаты Мазырскі край. З дахрысціянскіх часоў шырокае распаўсюджанне мелі шматлікія замовы, якія акцэнтавалі ўвагу на справядлівае ўладкаванне грамадскага жыцця, удасканаленне яго духоўнай аўры, фарміравалі веру ў чалавечыя магчымасці і незвычайную моц роднага слова. Многія замовы

накіраваны супраць амаральных якасцей людзей: “Ад ворагаў”, “Ад сплетнікаў”, “Ад п’янства” [2, 26]. Многія спалучаюць язычніцкую і хрысціянскую сімволіку: “На памяле еду, а вужам паганяю, а гадзюку зануздаю, а вам суддзі, сэрца замаўляю. Замаўляю сэрца хлебам і соллю і святою паскаю, каб стрэлі мой суд харошаю ласкаю” [6].

Істотны маральна-выхаваўчы патэнцыял нясуць у сабе народныя гульні. Многія з іх імітуюць рэальнае жыццѐ, адносіны паміж людзьмі, утрымліваюць у сваім змесце ў якасці абавязковых такія, якія дапамагаюць развіваць многія маральна-валявыя якасці іх удзельнікаў.

Неацэннае выхаваўчае значэнне мелі на Палессі народныя песні. Пачынаючы з калыханак у дзяцей фарміравалася ўласнае светабачанне, узбагачаўся і ўзвышаўся ўзровень маральнага развіцця. У песнях палешукоў значнае месца ўдзяляецца духоўным перажыванням і памкненням чалавека, разважанням аб чалавечых узаемаадносінах. Народныя песні раскрываюць складаныя ўзаемаадносіны ў традыцыйнай міжпакаленнай сям’і: паміж маці і дачкой, свякрухай і нявесткай, мужам і жонкай. Асабліва папулярныя народныя песні-балады: “Цячэ рэчанька-невялічанька, скочу-пераскочу…”, “А ў полі бероза, у полі кудравая”, “Аддала мене маці да ў чужую старану…” [5].

Як у іншых народаў багацейшы выхаваўчы патэнцыял утрымлівалі народныя казкі з іх павучальным ухілам, выразным размежаваннем дабра і зла, аптымістычнай упэўненасцю ў перамозе апошняга. Казкі не толькі раскрываюць змястоўнае напаўненне маральнасці асобы, а і вучаць, як будуваць адпаведную лінію паводзін.

Сапраўднай скарбонкай народна-педагагічнай мудрасці з’яўляюцца прыказкі і прымаўкі. Як і ў іншых народаў у палешукоў, яны, як правіла, маюць афарыстычную форму і павучальны змест, дзе народам адабрана і выкрышталізавана ўсѐ каштоўнае са свайго сацыяльна-гістарычнага вопыту, у тым ліку і з выхаваўчай практыкі. Да сѐнняшняга часу паўсядзѐнная мова насельнікаў Мазырскага Палесся дапаўняецца крылатымі выслоўямі для падмацавання сваіх довадаў, разваг. Аналіз прыказак і прымавак палешукоў падводзіць да высновы, што пераважная большасць з іх напрамую ці ўскосна скіраваны на працэс выхавання і перш за ўсѐ маральнае ўдасканаленне асобы.

Шматвяковы народны вопыт выпрацаваў даволі адладжаную самабытную сістэму маральнага выхавання. Прыкмечаныя ўстойлівыя сувязі, правераныя жыццѐм і часам, дазволілі ўстанавіць пэўныя заканамернасці, патрабаванне ўліку якіх падводзіла з аднаго боку да фармуліроўкі адпаведных прынцыпаў маральнага выхавання, а з другога – істотна павышала яго выніковасць.

Адзначаная вышэй цесная сувязь з навакольным асяроддзем дазволіла будаваць увесь выхаваўчы працэс у строгай адпаведнасці з прыродай. Прынцып прыродаўзгодненасці выхавання выкарыстоўваўся ў палешукоў шматпланава. Па-першае, пастаянна ўлічваўся фактар спадчыннасці: “Які куст, такі і адростак” [7]. Па-другое, выхаванне абапіралася на прыроду чалавека – полаўзроставыя і індывідуальныя асаблівасці дзяцей: “Дзеткі

адзінае маткі, ды не роўныя” [1, 133]; “Якія годы, такі і розум” [1, 136]. Патрэцяе, многія з’явы прыроднага ўладкавання па аналогіі пераносіліся і на выхаванне дзяцей: “Гні галінку, пакуль маладзенькая” [5].

Прынцып сувязі выхавання з жыццём быў настолькі ярка выражаным, што ў традыцыйнай педагагічнай культуры выхаванне амаль не выдзялялася ў самастойны працэс, а сінкрэтычна знітавана з усімі праявамі штодзённай рэчаіснасці. У гэтым сэнсе народнае выхаванне амаль тоесна сучаснаму разуменню сацыялізацыі асобы.

Навукоўцы, якія даследавалі жыццё, побыт і норавы палешукоў, адзначалі, што адной з умоў эфектыўнасці народнай педагогікі былі адзінства і нефармальная ўзгодненасць выхаваўчых намаганняў, усіх, хто меў прамое ці ўскоснае дачыненне да гадавання дзяцей. Рускія этнографы XIX ст. адзначалі, што ў глухіх палескіх вёсках назіраўся высокі маральна-духоўны ўзровень развіцця простых сялян. У многім гэта тлумачылася адзінствам і пастаянствам выхаваўчых падыходаў да дзяцей з боку бацькоў, сваякоў, суседзяў, аднавяскоўцаў: “Не спадабаўся народу – хоць кідайся ў воду” [1, 236]; “Грамада – вялікі чалавек” [1, 229]; “Сам сябе не хвалі, няхай людзі пахваляць” [1, 240].

Адной з істотных адметнасцей народнай педагогікі Палесся з’яўляюцца досыць мяккія, добразычлівыя адносіны да дзяцей: “Няшчасныя тыя дзіцяткі, якіх не жураць ні бацькі, ні маткі” [1, 134]. Фізічныя пакаранні выкарыстоўваліся ў выпадку выражанага непаслухмянства, і крайне рэдка пры выхаванні дзяўчынак. Часцей за ўсё іх замянялі патрабавальнасць, запалохванне, пагрозы: “Не паможа кіў не паможа і кій”, – заключалі ў народзе [5].

Традыцыйная педагагічная культура Мазырскага Палесся ў маральным выхаванні няўхільна прытрымлівалася прынцыпа сістэматычнасці. У народзе існавала перакананне, што настойлівасць, упартасць і карпатлівасць абавязкова прывядуць да маральнага ўдасканалення асобы: “Капля камень ні сілай доўбіць, а як часта на яго падае” [7]. Асаблівасць сялянскага побыту, сувязь вусна-паэтычнай творчасці з каляндарна-абрадавай дзейнасцю вылучалі ў якасці аднаго з ключавых прынцыпаў – прынцып цыклічнасці. З яго дапамогай адбываліся замацаванне і далейшае развіццё маральнай свядомасці.

Надзвычайным багаццем вызначаецца народная педагогіка палешукоў у выбары метадаў і сродкаў маральнага выхавання. Традыцыналізм, які вызначаў калектыўны маральны вопыт кандэнсаваўся ў пэўныя традыцыі, набываў выражаную стэрэатыпнасць і адначасова вырыятыўнасць. Шматлікія народныя традыцыі з іх усеагульнасцю, устойлівасцю ў часе, эмацыянальнай прывабнасцю з’яўляліся эфектыўнымі сродкамі маральнага выхавання. Стэрэатыпнасць традыцый, якія знаходзяцца ў дыялектычным адзінстве з варыятыўнасцю характэрны як для зместу, так і для формы ажыццяўлення. Такім чынам, традыцыналізм замацоўваў і развіваў маральную культуру як у межах канкрэтнага пакалення, так і на працягу гістарычнага шляху этнасу ўвогуле.

Выніковасць маральнага выхавання ў палешукоў падмацоўвалася многімі звычаямі, абрадамі, народнымі святамі.

У адрозненне ад акадэмічнай педагогікі народна-выхаваўчая сістэма палешукоў прыярытэт аддавала метаду практыкаванняў ці прывучэння. На эмпірычным узроўні было прыкмечана, што адпаведныя дзеянні, учынкі, якія шматкратна паўтараюцца, фарміруюць звычкі маральных паводзін, якія нярэдка ўжо на наступных этапах замацоўваюцца ў свядомасці.

Дзейснымі сродкамі метаду пераканання з'яўляліся на Палессі гутаркі, угаворы, растлумачэні, унушэнні: "Умеў дзіця радзіць, умей і вучыць" [1, 135]. Усе яны эфектыўна выкарыстоўвалі выхаваўчую сілу і моц роднага слова. Як і ў іншых народаў фальклор на Палессі быў не толькі скарбонкай педагагічнай мудрасці, а і важным выхаваўчым сродкам.

У маральным выхаванні палешукі актыўна выкарыстоўвалі метад прыкладу. У якасці ўзораў для пераймання выступалі станоўчыя героі калыханак, казак, легенд. Асабліва дзейсны ўплыў аказвалі прыклады з навакольнага асяроддзя.

Аналіз этыка-педагагічнай спадчыны традыцыйнай культуры Мазырскага Палесся дае падставы сцвярджаць аб яе самабытнасці, наяўнасці разнастайных выхаваўчых падыходаў, якія і сѐння з поспехам можна выкарыстоўваць у развіцці педагагічнай тэорыі і практычнай арганізацыі гэтых працэсаў.

**Спіс выкарыстанай літаратуры:**


1. Касько, У.К. Палескі дзівасіл: Бел. нар. прыказкі, прымаўкі, выслоўі: са скарбніцы А.К. Сержпутоўскага /У.К. Касько. – Мінск: Выш. шк., 2005. – 383 с.
2. Мазыр 850 год: у 3т.: Спрадвечнай мудрасці скарбонка:сучасны стан традыцыйнай культуры г. Мазыра / Укладанне, сістэматызацыя, тэксталагічная праца, уступныя артыкулы, рэдагаванне В.С. Новак [і інш.]. – Гомель: КВПУП "Сож", 2005 – Т. 3. – 296 с.
3. Сержпутоўскі, А.К. Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў /А.К. Сержпутоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1999. – 191 с.


**Спіс інфарматараў:**

4. Бурміч Харыта Мікалаеўна 1929 г.н. (г.п. Лельчыцы).
5. Калацэй Дар'я Лук'янаўна 1935 г. н. (г. Мазыр).
6. Лаўда Настасся Сцяпанаўна 1914 г.н. (г. Мазыр).
7. Тамашова Марыя Пятроўна 1924 г.н. (в. Каменка Мазырскага раёна).